Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

23 ЧЭРВЕНЯ 2015 г. АЎТОРАК № 117 (27975) Кошт 2000 рублёў

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА



**Мільёны ў вёдрах**

СТАР. 5




**Педагогі новага часу**

СТАР. 6



**Абнавілі сімвал горада**

СТАР. 8

## Мір і згода ў грамадстве — духоўны стрыжань нашай краіны

# ДЗЕЛЯ ГАЛОЎНЫХ КАШТОЎНАСЦЯЎ

**Падчас візіту Патрыярха Маскоўскага і ўсяе Русі Кірыла гэтыя словы былі, можна сказаць, лейтматывам. Пра гэта ў першую чаргу гаварыў і Прэзідэнт Аляксандр Лукашэнка падчас сустрэчы з прадстаяцелем Рускай Праваслаўнай Царквы.**

У нашай краіне шануюць і берагуць адсутнасць праблем ва ўзаемаадносінах прадстаўнікоў розных канфесій, адзначыў Прэзідэнт. Сустрэча праходзіла напярэдадні паездкі патрыярха ў Брэст, і кіраўнік дзяржавы звярнуў увагу на тое, што на поўдні краіны пражывае шмат каталікоў. «Праваслаўе і там, на заходніх межах нашай краіны, як ніколі магутнае. Каталікі і праваслаўныя жывуць вельмі мірна, у нас няма ніякіх адзін да аднаго прэтэнзій, — сказаў Аляксандр Лукашэнка. — Мы стараемся дапамагчы адным і другім, каб людзям было зручна і каб кожны знайшоў сваю дарогу да храма».

У Беларусі жывуць прадстаўнікі розных веравызнанняў, у пытаннях рэлігіі «людзі самі вырашаюць, дзе ім быць, як ім быць», падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка. У краіне цэняць адсутнасць праблем ва ўзаемаадносінах вернікаў і маюць намер захоўваць такое становішча рэчаў, адзначыў Прэзідэнт. «Я не бачу ніякіх праблем ва ўзаемаадносінах нашых вернікаў. Мы гэта вельмі цэнім і будзем берагчы, наколькі гэта магчыма», — падкрэсліў кіраўнік дзяржавы.

Важнасць гэтага даказвае сітуацыя ва Украіне. Канфлікт тут пачаўся менавіта з расколу ў царкве, «калі былі страчаны духоўныя каштоўнасці, калі іх сталі таптаць». «Усё гэта перайшло ў плоскасць ужо ваеннага супрацьстаяння», — заявіў беларускі лідар.

СТАР. 2



Фота БЕЛТА.

## ЦЫТАТА ДНЯ



**Тарас НАДОЛЬНЫ, першы намеснік старшыні праўлення Нацыянальнага банка:**

*«Працэнтныя стаўкі адлюстроўваюць эканамічную сітуацыю, гэта значыць сёння ў краіне дастаткова дарагія дэпазітныя стаўкі для таго, каб узмацніць зберажэнні ў беларускіх рублях, а высокая дэпазітная стаўка падцягвае за сабой крэдытную стаўку, таму што дэпазіты і насельніцтва, і юрыдычных асоб — гэта рэсурсы для выдачы крэдытаў».*

**■ Надвор'е**

# ТЫДЗЕНЬ ЛЕТНІХ ДАЖДЖОЎ

## На паўднёвым усходзе краіны яшчэ захаваецца пажаранебяспечнае становішча

**На гэтым тыдні чакаецца няўстойлівае і цёплае надвор'е, з сярэдняй тэмпературай паветра каля нормы, паведаміў начальнік службы гідраметэаралагічных прагнозаў Рэспубліканскага цэнтра па гідраметэаралогіі Дзмітрый РАБАЎ.**

Гэтымі днямі ў нас будуць гаспадарыць малаактыўныя атмасферныя франты з Заходняй і Паўночна-Заходняй Еўропы. Яшчэ сёння ўмовы надвор'я на тэрыторыі краіны будзе вызначаць вобласць павышанага атмасфернага ціску, аднак удзень у заходніх раёнах пачне адчувацца ўплыў франтальных падзелаў. Таму перавахна без ападкаў, толькі ўдзень па захадзе краіны пройдуць кароткачасовыя дажджы, месцамі навальніцы. Максімальная тэмпература паветра складзе 17-24 цяпла, а па паўднёвым усходзе Беларусі паветра прагрэецца да плюс 27 градусаў. Уначы на сераду на большай частцы, а ўдзень месцамі чакаюцца кароткачасовыя дажджы і навальніцы. Тэмпература паветра ўначы складзе 9-16 цяпла, удзень — плюс 17-23 градусы, а па ўсходзе краіны — 24-27 цяпла.

І надалей да канца тыдня ў Беларусі будзе гаспадарыць няўстойлівае і вільготнае паветра з боку Заходняй Еўропы. У чацвер месцамі пройдуць кароткачасовыя дажджы, магчымыя навальніцы. Тэмпература паветра ўначы складзе 8-15 цяпла, удзень — плюс 17 -23 градусы, па ўсходзе — 24-26 цяпла.

Паводле папярэдніх прагнозаў айчынных сіноптыкаў, у пятніцу і суботу месцамі таксама прагназуюцца кароткачасовыя дажджы і навальніцы. Уначы стане крыху халадней, калі тэмпература паветра чакаецца ў межах 6-13 цяпла, удзень будзе плюс 17-23 градусы, але па ўсходзе краіны ўначы прагназуецца плюс 14 -15 градусаў, а ўдзень месцамі да 24-26 цяпла.

Асобна спецыяліст адзначыў, што мінулыя дажджы значна палепшылі пажаранебяспечную сітуацыю па заходняй палове краіны, аднак на ўсходзе ўсё яшчэ захоўваецца складанае становішча. Напрыклад, у Мазырскім раёне застаецца апошні, пяты клас небяспекі. Кароткачасовыя і невялікія дажджы, якія будуць на гэтым тыдні, а таксама нераўнамернае іх размеркаванне па тэрыторыі краіны, пажаранебяспечную сітуацыю па паўднёвым усходзе краіны істотна не палепшаць, упэўнены Дзмітрый Рабаў.

**Сяргей КУРКАЧ.**
*kurkach@zviazda.by*

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 23.06.2015 г.

| | | |
|---|---|---|
| Долар ЗША | 15318,00 | ▲ |
| Еўра | 17331,00 | ▼ |
| Рас. руб. | 285,44 | ▲ |
| Укр. грыўня | 704,28 | ▲ |

ISSN 1990 - 763X

ЗВЯЗДА
Да чытача з любоўю!

ПІШАМ ПРА ТОЕ, ШТО САПРАЎДЫ ВАЖНА
5 разоў на тыдзень!
Ідзе падпіска на «Звязду» на III квартал і II паўгоддзе 2015 года!
Падпісацца на газету можна ў любым аддзяленні паштовай сувязі; з дапамогай аплатна-даведачнага тэрмінала РУП «Белпошта»; праз сістэму «інтэрнэт-падпіска» на сайце www.belpost.by; у кіёсках «Белсаюздрука»; у паштальёнаў.

Падпіска, дарэчы, можа стаць добрым падарункам для вашых родных і блізкіх, для вашых сяброў.